Нататкі вандроўніка

## Дарога да мора

***Ах, гэта прыгожая назва “Монтэнегра”! Як яна ўлагодзіла мой слых гуманітарыя і сэрца вандроўніка, такое схільнае да рамантычных прыгод! Нібы лагодным ветрыкам з экзатычных шырот атуліла мяне мара пра невядомую краіну з такім мілагучным імем. І мы з мужам вырашылі памяняць банкет да юбілейнай даты нашага сумеснага жыцця на падарожжа ў краіну-казку…***

Можна было б ляцець самалётам з Мінска, але пабачыць Еўропу з вышыні ў 10 тысяч метраў за нейкія тры гадзіны – гэта не ў нашых правілах. Лепш даўжэй, але з большай карысцю да ўсмяглага ад будзёнасці інтэлекту. Такім чынам, набыўшы ў турагенцтве пуцёўку, накіраваліся да жаданай Адрыятыкі праз Польшчу, Чэхію, Аўстрыю, Венгрыю, Сербію. Адразу адна маленькая заўвага: калі хочаце, каб паездка была таннейшай, звяртайцеся ў агенцтва чым раней. Многія сёння падарожнічаюць уласным транспартам, напярэдадні замовіўшы месцы ў гатэлях, праз інтэрнэт, выбраўшы маршрут і экскурсіі. Гэта прымальны варыянт для моладзі. Мы не рызыкнулі. Да таго ж, у самой Монтэнегра на кожным кроку прапаноўваюць машыны напракат прыкладна за 10 еўра ў суткі. Галоўнае, каб правы былі з сабой. Адна мая знаёмая з мужам на “пракатнай” машыне ўвесь востраў Крыт сёлета аб’ездзіла.

## Белы горад з водарам руж

Не магу сказаць, што доўгае сядзенне ў аўтобусе і назіранне за краявідамі - занятак вельмі натхняльны. Але як прыемна, прачнуўшыся раніцай у гасцінічным нумары, паснедаўшы амлетам з сасіскамі і круасанамі з кавай, пачуць ад суправаджаючага: “Праз тры гадзіны – мы ў Вене”! Усю дарогу да сталіцы Аўстрыі глядзім мастацкі фільм Эрнэста Марышкі “Сісі” з Ромі Шнайдэр у галоўнай ролі. Прыгожая і рамантычная гісторыя кахання прынцэсы Баварскай Элізабет і імператара Аўстрыі Франца Іосіфа падрыхтоўвае нас да сустрэчы з найпрыгажэйшым горадам не толькі Еўропы, але і свету. Не дзіва, што ў акружэнні шэдэўраў архітэктуры і мастацтва сфарміраваўся вытанчаны густ Франца Іосіфа, які выбраў сабе ў жонкі найпрыгажэйшую жанчыну з еўрапейскіх каралеўскіх дынастый. Імператрыца Элізабет Аўстрыйская стала сімвалам і ідэалам жаночай прыгажосці.

Але першым нас сустракае велічны помнік-манумент Марыі Тэрэзіі на плошчы яе ж імя. Побач з імператрыцай генералы, дарадчыкі, палітычныя дзеячы таго часу. Па правую і па левую руку ў былых каралеўскіх палацах, падобных як блізняты, цяпер музеі: прыродна-гістарычны і культурна-гістарычны. Калі б не Марыя Тэрэзія, то можна было б падумаць, што адзін з палацаў – гэта проста адлюстраванне. Заплаціўшы пару еўрыкаў за радыёгід (спецпрыстасаванне з навушнікамі), маем магчымасць чуць экскурсавода на адлегласці, таму можна не бегчы побач з гідам і не выцягваць шыю, натапырыўшы вушы, каб не страціць сэнс апавядання. Праўда, цудоўная архітэктура і, наогул, убранства горада настолькі завалодвае ўвагай, што я ўвесь час рызыкавала згубіцца сярод натоўпу падарожнікаў на вулках гістарычнай часткі старога горада. І не я адна. З гэтай нагоды наш венскі экскурсавод шукаў адметнае і бачнае месца, каб мы, заварожаныя прыгажосцю, маглі ўбачыць нарэшце яе, успомніўшы, што Вена – не канцавы пункт нашага падарожжа. А яшчэ нагадваў нам, каб у выпадку чаго арыентаваліся на купал сабора Святога Стэфана, які бачны з розных пунктаў.

Гэты сабор – сімвал Вены, адзін з нямногіх прадстаўнікоў эпохі раманскага стылю, што захаваліся тут. Наогул, сталіца Аўстрыі – музей пад адкрытым небам, дзе перамяшаліся розныя стылі розных эпох: готыка, барока, ракако, неарэнесанс і г. д. Тут вельмі шмат будавалася палацаў, таму што кожны новы кароль ці імператар ствараў для сябе новую

рэзідэнцыю, каб не жыць у будынку свайго папярэдніка. Горад быў заўжды багатым дзякуючы свайму геаграфічнаму месцазнаходжанню, рацэ Дунай і ўрадлівым глебам навакольных палеткаў. Таму і маглі яго ўладары дазволіць сабе такую раскошу – пабудаваць палац ці два палацы ў адпаведнасці з новымі архітэктурнымі тэндэнцыямі і еўрапейскімі густамі. А нашчадкі цяпер маюць вялікую колькасць выдатных музеяў, куды прыязджаюць турысты з усяго свету. Палацаў так шмат, што нават каралеўскія канюшні размясціліся ў адным з іх. Калі больш дакладна, гэта не проста канюшня, а школа іспанскай верхавой язды, вядомая сваімі белымі жарабцамі, якія танцуюць. Ліпіцыяны – выведзеная метадам рупнай селекцыі парода. Кажуць, нараджаюцца жарэбчыкі рудымі, асобныя - амаль чорнымі, але, падрастаючы, яны сівеюць. Ліпіцыянскі конь – неверагодна грацыёзны, высокі, беласнежны, лёгка трымае раўнавагу пры сваім каралеўскім вытанчаным целаскладзе.

Знаўцы сцвярджаюць, што ў шматлікіх музеях і мастацкіх галерэях мала шэдэўраў жывапісу, таму што стваральнікі сучасных калекцый, прадстаўнікі дынастыі Габсбургаў, не былі дасведчанымі прыхільнікамі мастацкай творчасці. Затое яны бясспрэчна валодалі музычным слыхам і густам, бо Вена працяглы час лічылася музычнай сталіцай свету. Асабіста для мяне гэты горад найперш асацыіруецца са славутымі кампазітарамі. Заснавальнікамі Венскай класічнай школы сталі без перабольшання вялікія Гайдн, Моцарт, Бетховен, якія стварылі геніяльныя музычныя творы. Тут нарадзіўся сусветна вядомы венскі вальс, дасягла найвышэйшага эпагею аперэта. Але так мала часу было ў нас, каб наведаць хоць Венскую оперу. Мімаходзь пабачылі толькі будынак, дзе жыў калісь Моцарт. Насамрэч у яго было некалькі кватэр, але захавалася толькі адна, дзе ён жыў у свой самы шчаслівы перыяд жыцця і стварaў “Вяселле Фігара”. Свой вольны час я патраціла на пошукі помніка Моцарту, і ў адным са сквераў знайшла-такі! Малады, прыгожы, грацыёзны, натхнёны, застыўшы з прыўзнятай рукой, якой нібы вітае прахожых…

А самыя яркія эмоцыі атрымалі ўсе мы пасля наведвання разарыя Народнага парку. Чаму “народны”, калі побач з каралеўскім палацам? Ніхто не ведае. Можа таму, што ўваход сюды быў адкрыты для ўсіх жадаючых. Сёння тут квітнеюць тысячы руж усіх колераў вясёлкі, а мо і болей. Тут у мяне пачалася ружовая хвароба. Фатаграфавала кожную кветачку асобна і кожны куст, які больш нагадваў невысокае дрэўца з кветкавай кронай. А адпачываючыя проста сядзелі і любаваліся прыгажосцю, атрымлівалі асалоду ад пахаў, нехта ўладкоўваўся прама пад ружовымі кустамі на газонах, іншыя ладзілі фотасесію, залазячы ў самы гушчар руж. Але папсаваных ці паламаных кустоў я не бачыла. Не было і пільных строгіх назіральнікаў, паліцэйскіх. Хіба ў каго падымецца рука на прыгажосць, што ратуе свет?

А цяпер адкажу, чаму ў гэтай першай частцы свайго допісу я згадала “Белы горад”. Усе вельмі проста. Вена пабудавана ў XI стагоддзі на месцы колішняга рымскага вайсковага лагера Віндабона, што ў перакладзе з кельцкага “белы горад”. Па ўсім відаць, што гэта быў даволі ўмацаваны горад-крэпасць, таму што туркі, якія два разы ў XVI і XVII стагоддзях імкнуліся яго захапіць, пайшлі адсюль нізчым. Найбольшага росквіту горад дасягнуў, калі быў сталіцай Аўстра-Венгрыі, падмяўшай пад сябе амаль трэцюю частку Еўропы. Аднак настальгіі па тых часах тут няма, а імперская свядомасць саступіла месца менталітэту свабодных духам рамантыкаў.



***У разарыі Народнага парку.***

Частка 2

**Вяртанне да вытокаў**

Новая раніца і сняданак у чарговым гатэлі. На гэты раз на тэрыторыі Венгрыі, дакладней – у Будапешце. Заўжды ведала, што назва сталіцы Венгрыі ўтварылася з дзвюх назваў Буда і Пешт, гарадоў на супрацьлеглых берагах Дуная. І тут высвятляецца, што ёсць яшчэ і Обуда – самы старажытны горад, які таксама ўвайшоў у склад сучаснага Будапешта.

Экскурсавод па Будапешце, былы грамадзянін Расіі, не хаваў свайго задавальнення тым фактам, што венгерскі народ, які стагоддзямі адстойваў сваю самабытнасць, сваю культуру, сваю мову праяўляе ўсё больш настойлівасці на шляху выхаду з Еўразвязу. Венгры не задаволены курсам еўрапейскіх палітыкаў, таму нават пагадзіліся зацягнуць тужэй паясы, каб вярнуць узятыя раней пазыкі Сусветнаму банку разам з працэнтамі і далей быць больш самастойнымі ў эканамічных і палітычных пытаннях. Не без захаплення наш гід апавядаў пра выкручасты гістарычны шлях гэтага гордага народа, пра тое, што венгры ніколі не перапісвалі сваю гісторыю, не імкнуліся падкарэкціраваць нейкія непрыемныя моманты, заўжды ганарыліся сваімі каралямі, ваеннымі перамогамі і наогул у свеце яны вядомы, як даволі ваяўнічая нацыя. Ці не расплатай за колішнюю агрэсію і "акупацыю" чужых тэрыторый стала вымушанае падпарадкаванне аўстрыйскім імператарам і чужой культуры на працягу стагоддзяў. Толькі напрыканцы XVIII стагоддзя пры імператрыцы Марыі Тэрэзіі крыху змяніўся курс на германізацыю вечна бунтуючай Венгрыі.

Тым не менш, ушанаваныя пры імператарскім двары былі толькі тыя, хто, маючы радаслоўную і тытулы, заставаліся прыхільнікамі латыні, нямецкай мовы і культуры. Культура венграў захавалася дзякуючы фальклору толькі на перыферыі. І ў тым, што сёння венгры маюць сваю мову, культуру, літаратуру, заслуга найперш правінцыйнай моладзі, якая пачала вялікую асветніцкую работу. Ствараліся літаратурныя таварыствы па

вывучэнні роднай мовы. Пачалі выдавацца першая газета, першы часопіс на венгерскай мове, узнік першы венгерскі тэатр. Сакавіцкая рэвалюцыя 1848 года і нацыянальна-вызваленчы рух далі новых пісьменнікаў, што паднялі на еўрапейскі ўзровень літаратуру Венгрыі.

**Каралі і гусары**

Большасць экскурсій па Будапешце пачынаецца ад Рыбацкага бастыёна. Хоць слова "бастыён" асацыіруецца з вялізнымі абарончымі збудаваннямі, насамрэч менавіта гэты аб'ект ніякага дачынення да баталій не мае. Ды й пабудаваны ён адносна нядаўна – нейкія сто гадоў таму. Гэта прыгожая дэкарацыя ля крапасной сцяны стала падарункам гільдыі венгерскіх рыбакоў да юбілею горада. Нельга не адзначыць, што ансамбль, дзякуючы таленавітым дойлідам, гарманічна ўпісаўся ў архітэктуру старажытнай Буды. Дарэчы, калі вам пашчасціць наведаць Будапешт, помніце: Буда і Обуда – гэта гарысты бераг Дуная, Пешт – пакаты, раўнінны. "Буда" – у перакладзе з кельцкага – "жывая вада". Расказваюць, што горад стаіць на пячорах, дзе шмат крыніц, тэрмальных вод. Нездарма ў былым каралеўскім палацы Сечэні цяпер знаходзіцца знакамітая ў свеце лячэбніца. Між іншым, як і ў гэтым палацы, так і ў многіх іншых каралі ніколі не жылі. Прыгожыя збудаванні прыстасаваны цяпер пераважна пад музеі. У адным невялічкім, побач з цэнтральнай плошчай Герояў – наогул чыгуначная станцыя. Ці не за гэта так любяць венгры сваіх каралёў?

А яшчэ ў народзе захавалася шмат паданняў, легенд, песень і казак пра мясцовых уладароў. Любімы кароль – Мацяш Корвін (у перакладзе "корвін" – воран). Ёсць шмат паданняў аб тым, як Мацяш заваяваў нават Вену і вярнуў сабе выкрадзеную аўстрыйцамі карону Святога Іштвана – сімвал каралеўскай улады венгерскіх манархаў. У народных песнях кароль Мацяш, каб лепш ведаць пра патрэбы свайго народа, часта падарожнічае, пераапрануўшыся ў вопратку простага чалавека. Ён смелы, мудры, жартаўлівы, сапраўдны герой, што аднаўляе справядлівасць. Яго імя для венграў – сімвал веры і надзеі. Нават сямісотгадовую царкву Дзевы Марыі на Будайскім узгорку гараджане настойліва называюць храмам святога Мацяша, хаця сам Мацяш пасадзейнічаў узвядзенню толькі адной паўднёвай вежы. Але ён паклапаціўся ўпрыгожыць званіцу сваім гербам з выявай вароны. Вылучаецца гэты храм, пабудаваны ў такім нетыповым для Будапешта гатычным стылі, яшчэ і чарапічным дахам, ды не зусім са звычайнай чарапіцы, а з маёлікі: стракатай, вясёлых фарбаў і цёплых адценняў.

Па архітэктурным праекце Фрыдэша Шулека каля сабора святога Мацяша пабудавана галерэя з белага каменю. Сем вежачак сімвалізуюць сем плямёнаў, што аб'ядналіся, паклаўшы пачатак венгерскай гісторыі. З глядзельнай пляцоўкі адкрываецца чароўная панарама горада, упрыгожанага блакітнай стужкай Дуная.

Недалёка ад ратушы помнік яшчэ аднаму легендарнаму венгру, герою-гусару, генералу часоў праўлення Марыі-Тэрэзіі - Андрашу Хадзіку. Начале малога атрада гусар здзейсніў кавалейрыйскі рэйд і захапіў Берлін. Узяўшы кантрыбуцыю, Хадзік вярнуўся ў Вену, дзе яго ўшанавалі Вялікім крыжам ордэна Марыі-Тэрэзіі. Ходзяць чуткі, што для імператрыцы, якая была прыхільніцай венграў, з прускай сталіцы прывезлі поўны куфар белых жаночых пальчатак. Але калі Марыя-Тэрэзія пачала іх прымяраць, высветлілася, што ўсе пальчаткі на левую руку. Кажуць, што "лятучыя гусары" паўтарылі свой ашаламляльны марш-кідок і, узяўшы прыступам Берлін у другі раз, запатрабавалі яшчэ адзін куфар з пальчаткамі для правай рукі. Ці так яно было насамрэч гісторыя маўчыць, але каля помніка прыгожаму венгерскаму гусару заўжды прыпыняюцца турысты і фатаграфуюць скульптуру.

Сэрца Будапешта – плошча Герояў. Гэты найпрыгажэйшы гарадскі ансамбль пад назвай "Тысячагоддзе набыцця Радзімы" быў пабудаваны да юбілею аб'яднання сямі венгерскіх плямёнаў. У цэнтры ўзведзена 36-метровая мармуровая калона, упрыгожаная скульптурай архангела Гаўрыіла. Карона і апостальскі крыж у руках архангела – сімвалы трыўмфу дзяржаўнасці Венгрыі. Вакол устаноўлены бронзавыя конныя статуі мадзьярскіх

правадыроў, венгерскіх каралёў, славутых дзяржаўных дзеячаў. Сімвалічныя фігуры зверху на каланадзе – алегарычныя выявы вайны, міру, працы, дабрабыту. Каменная пліта ў цэнтры плошчы – мемарыял венгерскім салдатам, якія загінулі ў полымі сусветных войнаў.

У адрозненне ад знешне бесклапотных венцаў, жыхары Будапешта падаліся мне больш заклапочанымі. Прадаўцы ў гіпермаркеце больш нервовыя. Можа таму, што адначасова з "еўрыкамі" тут ходзіць і нацыянальная валюта – форынты. А яшчэ вельмі складана было купіць талон на грамадскі транспарт. Пракампасціраваўшы білет, звярнула ўвагу, што за ўсю маю паўгадзінную паездку ніхто больш не падыходзіў да кампосцераў, хоць малаверагодна, што ўсе ехалі па праязных білетах. Тым не менш, грамадскі транспарт ходзіць строга па раскладу, а на электронных табло на прыпынках пасекундна высвечваецца час прыбыцця аўтобуса.

Гуляць па беразе Дуная, бавячы свой вольны час, доўга не прыйшлося: прагнаў навязлівы пах каналізацыі ад гэтай самай вялікай "еўрапейскай артэрыі". І хоць наведаць знакаміты музей марцыпанаў таксама не ўдалося, але пабачылі сапраўдныя творы мастацтва з марцыпанаў у кафэшках і магазінах. Гэты нацыянальны брэнд тут можна набыць у якасці сувеніра паўсюль. Для тых, хто не ў курсе: марцыпаны – гэта проста кандытарскія вырабы, накшталт мяккага ірысу ці нугі. Венгерскія дзеці яго выкарыстоўваюць як пластылін. Вылепленыя фігуркі можна затым з'есці: і смачна, і дробную маторыку развівае.



***Венгерскія каралі на плошчы Герояў.***

Частка 3

**Сэрца Будванскай Рыўеры**

Італьянская назва "Монтэнегра", хоць і прыгожа гучыць, але для славянскага вуха не перадае сакральнасці назвы гэтай краіны. Прачнуўшыся на ўсходзе сонца пасля начнога пераезду па тэрыторыі Чарнагорыі, убачыўшы за акном аўтобуса крутыя скалы, стромкія

горныя хрыбты, парослыя цёмна-зялёнымі, амаль чорнымі лясамі, пачынаеш разумець: нездарма гэту мясцовасць так назвалі. Дарога серпанцінам віхляла па горных схілах, нырала ў тунэлі, завісала на мастах праз рэкі і каньёны. Ах, гэты каньён! Спрасоння мне здалося, быццам зрок мяне падводзіць. Паглядзела праз акуляры і… дыханне перахапіла. Дарога пралягала над самым абрывам, які немаведама дзе заканчваўся. Крыху пазней даведалася, што каньён ракі Тара, які так мяне ўразіў, другі ў свеце па глыбіні пасля Гранд-Каньёна на плато Каларада ў ЗША.

Дарога, хоць і крутая, і пагражальна юркая, але з вельмі добрым пакрыццём, ды і шафёры нашы – проста асы! Першы прыпынак на невялічкай пляцоўцы побач з прыгожым пешаходным мастком праз Тару. Падарожнікі спяшаюцца сфоткацца над хуткаплыннай рэчкай на фоне прыгожых горных вяршынь. Нягледзячы на ранні час, працуе кафэ, а мясцовая гандлярка прапаноўвае сувеніры, здобу і яшчэ ракію, слівовіцу, крушку – самагон мясцовага разліву. Даведваемся, што ў гэтай краіне не забаронены вытворчасць і продаж самаробных традыцыйных алкагольных напояў. Наогул, яны тут – адзін з турыстычных брэндаў. Гарэлка хатняга прыгатавання прадаецца свабодна на базарчыках, у магазінах, сувенірных лаўках.

Маляўнічыя пейзажы зачароўваюць. Першы страх ад вышыні і непрывычна крутой дарогі саступае месца захапленню краявідамі, а таксама працай людскіх рук і інжынернай думкі, што стварылі такія магістралі паміж каменных нагрувашчванняў вышынёй у тры тысячы метраў. Горы былі і ворагамі людзей, што з глыбокай даўніны пасяляліся тут, і адначасова – абаронцамі. Вучоныя даказваюць, што першапачаткова тут жылі славянскія плямёны і хоць грэчаскія і рымскія каланісты далучылі гэтыя землі да сваіх краін, хоць пазней яны належалі Візантыі, але канчаткова ніхто так і не падпарадкаваў свабодалюбівы народ. Ды й туркі не здолелі заваяваць іх. Ні з чым пайшлі ад непрыступных сцен Каторскай крэпасці. Дукля, Зэта – старажытныя назвы Чарнагорыі, у якой ажно да новагістарычных часоў існавала племянная структура, дзе кіравалі князі з царкоўным тытулам епіскапа. Напачатку ХХ стагоддзя ў яе з’явіўся свой кароль і дзяржаўны лад набыў свецкія рысы. Сёння гэта невялічкая краіна з насельніцвам каля 620 тысяч чалавек займае 155 месца ў свеце па тэрыторыі.

Яшчэ большым захапленнем напаўняецца сэрца, калі горы крыху расступаюцца і вачам адкрываецца блакітна-бірузовы далягляд – Адрыятыка! Так і хочацца сказаць: “Дык вось ты якое, Адрыятычнае мора! Неверагодна багатых адценняў і паўтаноў паміж ультрамарынам і малахітам!” Далей ажно да самай Будвы, курортнага гарадка, дзе нам адпачываць ажно 10 дзён, дарога пралягае па схілах гор над морам. Справа - скалы, злева - марская далячынь у пацерках астраўкоў.

Бранка – гаспадар прыватнага гатэля “Мір”, дзе для нас быў забраніраваны нумар, прыняў вельмі ветліва, гаварыў па-руску, хоць і з вялікім акцэнтам. Сказаў, што сын добра валодае рускай мовай, таму, калі што, звяртацца да яго. Жонка гаспадара Весна, правяла нас да пакойчыка, што аказаўся даволі пасторным, з невялічкім кухонным кутком і дадатковым выхадам на шырокую тэрасу. На гэтай тэрасе мы іншы раз снедалі ці вячэралі, любуючыся прыгожымі горнымі краявідамі.

Будва – старажытны чарнагорскі гарадок. Ёсць сведчанні, што на гэтым месцы людзі сяліліся яшчэ ў 5 стагоддзі да нашай эры. Па легендзе, Кадмус Фінікійскі, якога выгналі з Грэцыі разам з жонкай Гармоніяй, пасяліўся тут і пачаў адбудоўваць горад у адпаведнасці з густамі той эпохі. Пазней тут пакінулі свой след рымляне, правілі ёй князі Дуклі, затым венецыянцы, аўстрыйцы. Пасля Першай сусветнай вайны горад, як і ўся Чарнагорыя, – у складзе Югаславіі. Цяпер Будва - адзін з буйнейшых курортаў незалежнай Чарнагорыі. У 1979 годзе тут адбыўся моцны землятрус, які разбурыў большую частку горада. Але ўсе гістарычныя будынкі даўно адбудаваны, слядоў прыроднай катастрофы амаль не засталося.

Калі вы спытаеце, што найбольш уразіла мяне ў Чарнагорыі, адкажу нечакана. Нягледзячы на багатую міжземнаморскую флору, старажытныя крэпасці, казачныя домікі

пад чарапічнымі дахамі, дружалюбнасць і прыязнасць мясцовых жыхароў і шмат розных адкрыццяў, мяне ўзрушыла карціна на гарадскім базарчыку “Зелена п’яца”: мяхі ў рост чалавека поўныя лісічак і сушаных баравікоў! Аказваецца, мясцовыя лясы багатыя гэтымі грыбамі. Праўда, цана іх не па кішэні сярэднестатыстычнаму беларускаму турысту – 15 еўра за кг. А яшчэ настальгічныя моманты абудзілі ў душы ўспаміны дзяцінства. У гэтых момантах смак самаробных сыроў з авечага і казінага малака, густа-жоўты, амаль аранжавы, колер жаўткоў хатніх курыных яек, вэнджанае на ядлоўцы мяса, вяленая паляндвіца, смажаная свежая рыба…

Па дарозе да пляжа нас перахапілі агенты турбюро. Іх тут вельмі многа, кожны імкнецца зарабіць у гэты спрыяльны час. Маршрутаў шмат, але ёсць тры ці чатыры найбольш запатрабаваныя турыстамі. Для тых, хто як мы “паўЕўропы прапахалі” аўтобусам, найперш прапануюць марскі праменад на “пірацкім” караблі. Нібы міфічныя сірэны цешылі наш слых абяцаннямі неверагодных адкрыццяў у падарожжы па Бока-Каторскім заліве кіраўніца агенцтва Ліля і дзве яе памочніцы, дзяўчаты з Новасібірска, якія перабраліся ў Чарнагорыю на пастаяннае месца жыхарства. Раптам заўважаю на рэкламным стэндзе наш дзяржаўны сцяжок. На маё здзіўленне Ліля адказала, што гэта памяць пра Беларусь ад дырэктара іх турагенцтва, які быў закаханы ў беларуску і нават наведваў нашу краіну.

Пачатак чэрвеня – гэта толькі пачатак курортнага сезона. На пляжах свабодна. Можна нават у некаторых месцах бясплатна карыстацца лежакамі. У мора заходжу па дробнай гальцы, якая прыемна масажыруе ступні. Вада прахалодная. Праўда для нас з мужам, якія адкрылі плавальны сезон яшчэ ў красавіку, гэта не праблема. Адпачываючыя з паўдзённых краін купацца не рызыкуюць. Першае ўражанне ад купання, што вада не проста цябе трымае на плыву, але нават выпіхвае асобныя часткі цела на паверхню. Гэта з-за высокай канцэнтрацыі солі і мінеральных рэчываў. Мора тут вельмі салёнае, ныраць з расплюшчанымі вачамі не пажадана – пякуцца аж смыляць слізістыя. Праз некалькі заходаў у мора прыстасавалася не плаваць, а “хадзіць” перабіраючы нагамі ў вадзе, як пры катанні на ровары.

Пагрэўшы бакі на міжземнаморскім сонцы, ідзём на экскурсію ў гістарычны цэнтр Будвы. Старажытныя вузкія вулачкі з каменнымі будынкамі, абвітымі ліянамі з ярка-чырвонымі кветкамі, прывялі да пляцоўкі, якая нагадвае канцэртную залу. Крыху ўбаку ад яе, паміж кафэшкай і крапасной сцяной, у цяньку сядзіць сталага веку гітарыст і нешта наігрывае. Прыселі і мы, заказаўшы напітак афіцыянту, што нібы джын узнік перад нашым столікам. Рэпертуар гітарыста складаўся пераважна з песень савецкіх часоў, верагодна, што разлічваў ён на “падаянне” ад людзей больш сталага ўзросту з тэрыторый былога СССР. Але турысты раўнадушна праходзілі міма. Калі ён заспяваў “Падмаскоўныя вечары”, я не вытрымала, заспявала, перасеўшы на каменныя прыступкі побач з вулічным музыкантам. Дуэт атрымаўся нядрэнны, відаць, бо людзі пачалі падыходзіць і кідаць еўрыкі ў футляр. Пазней разгаварыўшыся, даведаліся, што гітарыст з Сербіі. Адзінокі пенсіянер з сярэднестатыстычнай пенсіяй, таму мусіць падпрацоўваць такім чынам летам. У яго шмат сяброў у Расіі. Але, каб туды наведацца на госці, трэба папрацаваць дадаткова. Кінуўшы еўрык у футляр, накіроўваемся дадому. Змяркаецца.



*Праваслаўны храм Св. Савы і касцёл Св. Марыі ў старой Будве – сведчанне рэлегійнай талерантнасці чарнагорцаў.*

Частка 4

**Горад-порт, горад-сад, горад прыступак**

**Пасля трохдзённай паездкі аўтобусам праз пяць еўрапейскіх краін хочацца проста адпачываць на пляжы, гуляць пешшу, адчуваць пад нагамі цвёрдую глебу. Але кожны дзень, ідучы на пляж, атрымлівалі візітоўкі і буклеты ад турагентаў з прапановамі самых разнастайных падарожжаў па Чарнагорыі. На трэці дзень я здалася. У рукі трапіла прапанова падарожжа на пірацкім караблі па Бока-Катарскай бухце. Арганізатары абяцалі, што па караблі можна будзе перамяшчацца, загараць на верхняй палубе, карыстацца паслугамі буфета і рэстарана, а яшчэ наведванне фантастычнага пірацкага фіёрда Плава Спілія (Блакітная Дзюрка або Блакітная Пячора) і купанне ў адкрытым моры. Рашаючым фактарам стала тое, што скура пачынала памалу смылець ад перабору ультрафіялету і патрэбны быў антракт паміж сонечнымі працэдурамі. Такім чынам накіраваліся ў марскую вандроўку.**

Хто з нас у школьныя гады, начытаўшыся прыгодніцкіх раманаў Жуль Верна і Роберта Луіса Стывенсана, не марыў пра марскія падарожжы, дзіўныя краіны, захапляльныя падзеі! Гэтыя дзіцячыя мары і фантазіі ўвасабляліся па меры таго, як наш “фрэгат”, барануючы марскія абсягі, прычальваў то да аднаго, то да другога берага заліва ці проста кідаў якар ля невялічкіх астраўкоў. Чароўныя казкі, мясцовыя легенды маракоў занатаваныя не толькі ў народнай творчасці, але знайшлі сваё ўвасабленне ў своеасаблівай архітэктуры.

На карце выява Бока-Катаскай бухты нагадвае матылька ці нават двух матылькоў, кожнае іх крыльца з’яўляецца залівам, які атрымаў назву ад горада, што там знаходзіцца. Навукоўцы сцвярджаюць, быццам Бока-Катарскі заліў, які на 28 кіламетраў уразаецца ў сушу, - русла затопленай морам ракі. Гэта самы вялікі фіёрд Міжземнамор’я.

Першы наш прыпынак у порце прызнанага самым прыгожым горадам свету ў 1997 годзе - Херцэг Нові. Якімі эпітэтамі і фразеалагізмамі не ўзнагароджваюць гэту мясцовасць! Пабудаваны на горных схілах ля падножжа вяршыні Ар’ен, горад месціцца на тэрасах, куды вядуць шматлікія прыступкі. Кажуць, каб падняцца на самы высокі пункт, трэба прайсці больш за 650 прыступак. Жыхары тут адлегласць да мора лічаць не метрамі, а колькасцю прыступак. Я налічыла роўна 350 і апынулася на цэнтральнай старажытнай плошчы. Больш займацца лічылкамі не хацелася, таму што адкрываўся неверагоднай прыгажосці краявід: аліўкавыя гаі, вінаграднікі, кіпарысы, пальмы - патанаючы ў зеляніне разнастайных экзатычных раслінах горад і малахітава-ізумрудны заліў. Тут да назвы “горад прыступак” далучалася “горад-вечна квітнеючы сад”. Апавядаюць, што маракі, прыплываючы з розных куткоў свету, прывозілі дадому ўсялякія расліны. Кліматычныя ўмовы спрыялі іх прыжыванню. Напачатку чэрвеня тут квітнелі цытрусавыя, сціпла чырванелі кветачкі граната, шыкоўна распускаліся магноліі, пышна і markdownрознакалярова радавалі вока кветкі, якія мая гаспадыня Весна называла летаніяй. А колькі відаў квітнеючых кактусаў тут чакае аматараў гэтай хатняй (для нас) расліны! І якія яны высокія! Каля аднаго з асабнякоў пад раскідзістым дрэвам убачыла апад апельсінаў. Гід патлумачыў, што гэта мясцовыя апельсіны, па смаку яны нагадваюць недаспелыя грэйпфруты. Таму спакуса сабраць іх адразу прайшла.

Пра неспакойную і часта трагічную гісторыю Херцэг Нові, які знаходзіцца пры самым ўваходзе ў Бока-Катарскую бухту з Адрыятычнага мора, сведчыць многае, асабліва ваенна-марскія музеі пад адкрытым небам. Горад мусіў бараніцца ад шматлікіх заваёўнікаў, што марылі кантраляваць гэты вузкі перашыек, каб збіраць падаткі з караванаў караблёў. Таму і ў архітэктуры прысутнічаюць элементы абарончага стылю.

Далей кіруемся ў адкрытае мора, каб, перасеўшы на невялічкі кацярок, наведаць так званую Пірацкую пячору. У прамым перакладзе з чарнагорскай мовы яна называецца Блакітная дзюрка. Мусіць тут хаваліся не піраты, а ад піратаў. Думаецца, што насамрэч флібусцьеры на сваіх вялікіх парусніках наўрад ці маглі пранікнуць у чэрава гары такім чынам, як гэта зрабілі мы на лёгкім катары. Вопытны “марскі воўк”, што кіраваў нашай “пасудзінай”, дачакаўся, калі хваля апусціцца і паднырнуў пад навіслыя скалы, а плынь занесла наша “судзёнышка” ў самы цэнтр пячоры, куды не пранікалі сонечныя промні. Які гэта цуд! Сінеча ахінула ўсё навокал: неверагодна сінія хвалі, пагрозлівыя ультрамарынавыя сцены, паросшыя сталактытамі, блакітная паветраная смуга…

Удосталь наплаваўшыся ў сініх водах, нагуляўшыся з хвалямі, насыціўшы вочы прыгажосцю, вяртаемся на свой карабель, і выбіраем курс на самы вузкі праліў Верыге, за якім таямніча-чароўны востраў Багародзіцы на Рыфах.

Пасля водных працэдур самы час падмацавацца. Нам прапаноўваюць свежасмажаную рыбку і салату, прыпраўленую аліўкавым алеем. Дарэчы, у Чарнагорыі гэта самы папулярны алей. Забягаючы наперад, скажу, што пасля дэгустацыі страў мясцовай кухні я ўцягнулася ў аліўкавы густ і амаль адмовілася ад такога любімага маянэзу.

**Любоў, расстанне і чаканне**

Востраў Госпа од Шкрпела (Багародзіцы на рыфах) рукатворны. Побач з востравам Св. Георгія, дзе са старажытных часоў знаходзіцца Бенедыцыянскае абацтва, у сярэдзіне 15 стагоддзя знайшлі на штучнай выспе ікону Божай Маці. Магчыма, яна трапіла сюды з карабля, што пацярпеў крушэнне. Але, як гэта часта бывае, людзі ўгледзелі ў тым знак Божы і пабудавалі востраў і храм на ім. Свой знешні выгляд царква не мяняла з 17 стагоддзя. Тут любяць вянчацца маладажоны. У музеі захоўваецца ўнікальная ікона, вышытая залатымі і сярэбранымі ніткамі і… чалавечымі валасамі. Майстрыха стварала гэты шэдэўр, чакаючы каханага з марскога паходу. Міналі гады, закончыліся залатыя і

сярэбраныя ніткі, тады яна пачала абразаць свае косы і вышываць валасамі. Некалькі разоў падстрыгала, таму апошнія валасы – сівыя. Гэта ікона стала сімвалам вернасці і чакання.

Самым утульным і зацішным лічыцца Катарскі заліў бухты, які атрымаў назву ад горада-крэпасці Катар. Унікальнае відовішча адкрываецца вачам падарожнікаў, якія сыходзяць па трапе і кіруюцца да гістарычнай часткі горада. Магутная фартыфікацыйная сістэма, у аснове якой крапасныя сцены 20-метровай вышыні, узнімаецца высока ў горы ажно да крэпасці Святога Івана. Дзякуючы гэтым надзейным умацаванням старажытны горад выдатна захаваўся ў адрозненне ад іншых сярэдневяковых населеных пунктаў Еўропы. З 15 па канец 18 стагоддзя Катар і яго ваколіцы былі пад уладай Венецыянскай рэспублікі. Шматлікія каштоўныя помнікі старажытнасці паспрыялі таму, што горад трапіў у міжнародны спіс ЮНЕСКА “Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны”.

Калі хочаце адчуць сябе ў атмасферы сярэднявечча, наведайце Катар. Узоры сакральнай архітэктуры, асіметрычная структура вузкіх вулак і невялікіх плошчаў, старажытныя сцены, адпаліраваная мільёнамі ног брусчатка, на якой так проста паслізнуцца ў дождж – усё гэта спрыяе вашаму творчаму ўяўленню і тэлепартацыі вашай свядомасці ў глыб стагоддзяў. Яшчэ пра адзін узор рэлігійнай памяркоўнасці мясцовых жыхароў абавязкова раскажа экскурсавод каля сцен царквы Святога Лукі. Цікавы гэты храм тым, што ў ім знаходзяцца два алтары – каталіцкі і праваслаўны. Напачатку гэта быў каталіцкі касцёл, але ў 17 стагоддзі, ратуючыся ад турэцкіх захопнікаў, у Катары знайшлі прытулак праваслаўныя вернікі, якім дазволілі маліцца і нават стварыць алтар у храме Св. Лукі. Яшчэ адзін цікавы храм – сабор Святога Трыфана. Землятрус некалькі разоў разбураў яго, але грамадзяне адбудоўвалі, праўда, з-за недахопу сродкаў здарылася так, што верхавіны башняў атрымаліся розныя.

Пра Чарнагорыю можна апавядаць бясконца доўга. Але лепш наведацца туды. Немагчыма не палюбіць гэту маленькую, яркую і незвычайна адметную краіну.



***Востраў Багародзіцы на рыфах.***

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**